Мясцовы інтарэс

# Малы залатнік, ды дарагі

**У Гродзенскай вобласці распрацаваны праграмы развіцця 30 малых гарадоў і пасёлкаў, дзе вызначаны перспектывы гэтых населеных пунктаў і размешчаных там арганізацый, прадугледжаны меры для стварэння новых вытворчасцяў і рабочых месцаў.**

Абласныя ўлады давалі, як кажуць, ад варот паварот дрэнна падрыхтаваным праграмам і некаторыя з іх неаднаразова перапрацоўваліся. Да ацэнкі кожнага інвестыцыйнага праекта падыходзілі з пункту гледжання ўплыву на жыццё тэрыторый і, безумоўна, рэальнасці яго ажыццяўлення, прычым з разбіўкай па гадах і канкрэтна па ўсіх крыніцах фінансавання — уласных сродкаў прадпрыемства, дзяржаўных і крэдытных рэсурсаў. Пры гэтым была праведзена рэвізія літаральна ўсіх будынкаў, якія не выкарыстоўваюцца альбо недабудаваныя, з мэтай іх уцягнення ў гаспадарчы абарот. Пасля гэтага некаторыя з аб'ектаў, якім не шанцуе на аўкцыённых таргах, будуць прадавацца новым уладальнікам за адну базавую велічыню.

У Дзяржаўную комплексную праграму развіцця рэгіёнаў, малых і сярэдніх гарадскіх пасяленняў на 2007—2010 гады ўвайшлі 35 інвестпраектаў на Гродзеншчыне. А ўвогуле толькі сёлета прадугледжана рэалізацыя 117 праектаў, на якія ўжо выкарыстана 258 мільярдаў рублёў. Да прыкладу, у ААТ «Смаргоньсілікатабетон» арганізавалі вытворчасць сухіх будаўнічых сумесяў, на Смаргонскім агрэгатным заводзе — трактара «Беларус-921», а на Смаргонскім хлебазаводзе — соладу. У Карэлічах узяліся за выраб тратуарнай пліткі, аконных блокаў, жалезабетонных агароджаў. У Ашмянах пабудавалі асфальтазавод, стварылі прадпрыемствы па вытворчасці катлоў, а таксама вокнаў і дзвярэй, у ААТ «Радыётэхніка» наладзілі выпуск малагабарытнай сельскагаспадарчай тэхнікі. Прадпрыемства «Ваўкавыскбудматэрыялы» дапаможа вобласці, а мажліва, не толькі ёй, вырашыць праблему папяровых мяшкоў для сыпучых матэрыялаў. А на Слонімскім аўтарамонтным заводзе мяркуецца арганізаваць вытворчасць мікрааўтобусаў для патрэбаў хуткай медыцынскай дапамогі.

З 1 чэрвеня гэтага года, у прыватнасці, праблемным арганізацыям, якія зарэгістраваныя і дзейнічаюць у малых і сярэдніх гарадскіх пасяленнях, прадастаўляецца дзяржаўная падтрымка па падатку на прыбытак у памеры 50 працэнтаў ад устаноўленай заканадаўствам стаўкі. Яны вызваляюцца ад выплаты падатку з карыстальнікаў аўтамабільных дарог і збору ў рэспубліканскі фонд падтрымкі вытворцаў сельскагаспадарчай прадукцыі, харчавання і аграрнай навукі. А некаторыя мясцовыя Саветы дэпутатаў Гродзеншчыны ўжо скарысталіся правам устанаўліваць льготы па падатках на нерухомасць, зямельнаму і экалагічнаму для тых арганізацый, якія рэалізуюць у малых і сярэдніх гарадскіх пасяленнях інвестыцыйныя праекты па мадэрнізацыі вытворчасці для выпуску канкурэнтаздольнай прадукцыі і стварэння новых рабочых месцаў.

Дзяржаўныя прэферэнцыі прадугледжаны і для развіцця ў малых і сярэдніх гарадах прадпрымальніцтва. Сёлета ў Ваўкавыску наладжана вытворчасць сталярных вырабаў, у Воранаве — пашыву жаночага адзення, у Астраўцы пачалі выпускаць зварачныя апараты, у Слоніме — металавырабы, гофратару, у Смаргоні — зборныя канструкцыі з дрэва. А ў Зэльве, Іўі, Карэлічах і Міры дзякуючы прадпрымальнікам з'явіліся новыя міні-кафэ.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

# Глускія ягады і грыбы будуць марозіць на экспарт

**У Глуску будуецца цэх па замарозцы дзікарослых грыбоў і ягад. Гэта праект спажывецкай кааперацыі, які запрацуе на поўную магутнасць у 2008 годзе.**

Глуск — цэнтр найбольш багатай сыравіннай зоны ў Магілёўскай вобласці. Нарыхтоўшчыкі называюць Глусчыну «таварным раёнам» — у лясах шмат ягад і грыбоў, і да таго ж яны радыяцыйна чыстыя. Сёлета тут было сабрана больш за 130 тон чарніц. Нарыхтаваныя 15 тон грыбоў за добры вынік не лічаць — сёлета быў неўраджай. Аднак лясныя ягады і грыбы — гэта традыцыйны тавар, якім можа пахваліцца Глускі раён.

Таму цэх замарозкі — гэта выгадная, эканамічна пралічаная справа. Тым больш што дзікарослыя ягады і грыбы экспартуюцца за межы Беларусі. Замарожаныя дары беларускіх лясоў карыстаюцца ў іншых краінах павышаным попытам. Напрыклад, сёлета ў Магілёўскай вобласці нарыхтавалі паўтысячы тон чарніц, і ягад было столькі, што іх не паспявалі марозіць.

Новы глускі цэх дазволіць замарожваць дзве тоны прадукцыі ў гадзіну. Халадзільнае абсталяванне разлічана на захоўванне 500 тон замарожаных грыбоў і ягад.

Абсталяванне для цэха вырабілі ў Швецыі і Італіі. Гэта новыя тэхналогіі: шокавая замарозка дазваляе захаваць усе каштоўныя рэчывы, вітаміны і мінералы дароў лесу. З яе дапамогай ягады і грыбы марозяцца імгненна: унутры іх тэмпература 18 градусаў марозу, а захоўваюцца яны пры мінус 25.

Будаўніцтва цэха вядзецца з верасня і, паводле планаў, павінна быць завершана да Новага года. На праект спатрэбіліся 8 млрд рублёў: гэта крэдытныя рэсурсы, сродкі інавацыйных фондаў, аказаў падтрымку і бюджэт.

— Гэты праект уваходзіць у Праграму развіцця малых гарадоў, — пракаментаваў намеснік старшыні райвыканкама Рыгор Бяляцкі. — Для горада цэх па замарозцы дзікарослых грыбоў і ягад дасць павелічэнне вытворчасці спажывецкіх тавараў на 30 працэнтаў, нават калі цэх будзе працаваць толькі сезонна. Акрамя гэтага, будуць створаны 34 новыя працоўныя месцы.

У Глускім райвыканкаме слушна гавораць, што адкрыццё новых вытворчасцяў цягне за сабой і стварэнне новай сацыяльнай сферы вакол іх. Гэта вядзе да павелічэння занятасці і пакупніцкай здольнасці людзей, выкананне ўсіх сацыяльных стандартаў і, як вынік, паляпшэння дабрабыту народа.

У гарадскім пасёлку Глуск да Новага года павінны адкрыцца яшчэ дзве новыя крамы. Прыватныя унітарныя прадпрыемствы плануюць гандляваць харчовымі таварамі ў сучасным стылі: з сістэмай самаабслугоўвання, выкарыстаннем банкаўскіх картак, з акварыумам для жывой рыбы і г.д. Раённы цэнтр развіваецца.

**Ілона ІВАНОВА.**

**Зачетную книжку** студента ИГУ АЦП РБ № 04860/з на имя Миневича А.М. **считать недействительной.**

## ПРААН: Беларусь — краіна з высокім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу

**Праграма развіцця ААН апублікавала Справаздачу аб развіцці чалавека за 2007—2008 гады. У дакуменце гаворыцца, што Беларусь займае 64-е месца па ўзроўні развіцця чалавечага патэнцыялу сярод 175 краін свету, а таксама дзвюх тэрыторый. Такім чынам, рэспубліка адносіцца да групы краін з высокім узроўнем развіцця.**

Справаздача рыхтуецца ПРААН з 1990 года. У новым дакуменце на першым месцы па ўзроўні развіцця чалавечага патэнцыялу аказалася Ісландыя. За ёй ідуць Нарвегія і Аўстралія. Беларусь жа апярэдзіла ўсе краіны СНД. Так, Расія займае 67-е месца, Казахстан — 73-е, Украіна — 76-е. Апошнія дзве дзяржавы з-за гэтага аднесены ўжо да краін з сярэднім узроўнем развіцця чалавечага патэнцыялу.

Як паведаміў намеснік міністра замежных спраў Беларусі Віктар Гайсёнак, Справаздача рыхтуецца на аснове трох асноўных паказчыкаў: чаканай працягласці жыцця пры нараджэнні, узроўню пісьменнасці дарослага насельніцтва, ВУП на душу насельніцтва (парытэт пакупніцкай здольнасці ў доларах ЗША). Паводле першага паказчыка, Беларусь заняла 106-е месца ў свеце, паводле другога — 33-е і паводле трэцяга — 72-е.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

### СПЕКУЛЯВАЎ НА БРАТЭРСТВЕ

**Праваахоўнымі органамі выяўлены чарговы махляр, які шчыраваў на «карупцыйнай ніве».**

Паводле звестак прэс-цэнтра Генеральнай пракуратуры, адзін сталічны аферыст пасля вызвалення з турмы вырашыў разбагацець, спекулюючы на братэрскіх пачуццях. Прайдзісвет знайшоў заможнага чалавека, брат якога быў асуджаны на 22 гады пазбаўлення волі за шэраг злачынстваў, і нейкім чынам здолеў яго пераканаць, што дапаможа змякчыць прыгавор. Махляр запрасіў 50 тыс. долараў, патлумачыўшы, што грошы павінен перадаць службовым асобам Вярхоўнага Суда і Генеральнай пракуратуры. Брат асуджанага выплаціў «аванс» у памеры 35 тыс. долараў. Зразумела, што гэтыя грошы прайдзісвет пакінуў сабе. Махляра затрымалі.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

### ЗНІКЛА ПАРТЫЯ СЫРУ, АЎТАМАБІЛЬ І ВАДЗІЦЕЛЬ

**Яшчэ 23 лістапада ў Бялынічах, на філіяле прадпрыемства «Бабушкина крынка», была адгружана партыя сыру ў 20 тон. Груз прыняў 47-гадовы вадзіцель, які на аўтамабілі МАЗ павінен быў перавезці яго ў Віцебскую вобласць.**

Праз чатыры дні на бялыніцкае прадпрыемства, а потым і ў міліцыю, звярнуўся занепакоены прадпрымальнік з пасёлка Обаль, якому і належаў груз. Ні сыру, ні вадзіцеля, ні аўтамабіля так і не дачакаліся на Віцебшчыне. Між тым, 20 тон дэфіцытнага прадукту каштуе прыкладна 90 тыс. долараў. І куды зніклі МАЗ і чалавек? Цяпер праверку ўсіх абставін праводзіць міліцыя. На другую палову дня 28 лістапада груз, аўтамабіль і вадзіцеля не знайшлі.

**Ілона ІВАНОВА.**

## «Кульгае» якасць — знікае законнасць

**Сёлета пракурорамі адменена 2495 незаконных пастаноў аб узбуджэнні крымінальных спраў.**

Учора на калегіі Генеральнай пракуратуры быў прааналізаваны стан законнасці падчас прыцягнення грамадзян да крымінальнай адказнасці.

Як паведамілі ў прэс-цэнтры Генпракуратуры, следчыя і супрацоўнікі органаў дазнання за 9 месяцаў гэтага года завяршылі 57 447 крымінальных спраў, з якіх 49 238 — накіравалі ў суды. Сёлета 148 нашых суграмадзян сталі ахвярамі незаконнага крымінальнага праследу. Пракурорамі адменена 2495 пастаноў аб узбуджэнні крымінальных спраў.

Генеральны пракурор звярнуў увагу на неабходнасць паляпшэння нагляду за дзейнасцю органаў крымінальнага праследу.

**Мікола ДЗЯБЁЛА.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ТУСК ПАСТАВІЎ ПРЭЗІДЭНТА ПОЛЬШЧЫ НА МЕСЦА

**Прэзідэнт Польшчы Лех Качыньскі выказаў крайняе здзіўленне тым, што, аказваецца, афіцыйная пазіцыя Варшавы ў адносінах да ўступлення Расіі ў Арганізацыю па эканамічным супрацоўніцтве і развіцці раптам змянілася. І змяніў яе прэм'ер Дональд Туск, які напярэдадні паведаміў, што Польшча здымае сваё вета на ўступленне РФ у АЭСР.**

У афіцыйным паведамленні адміністрацыі прэзідэнта Польшчы гаворыцца, што «ў Канцылярыі прэзідэнта Польшчы з найвышэйшым здзіўленнем успрынялі дэкларацыю Дональда Туска...» Але прэм'ер паставіў прэзідэнта Качыньскага на месца, спаслаўшыся на Канстытуцыю Польшчы, у якой гаворыцца, што менавіта прэм'ер вызначае знешнюю палітыку краіны.

### ЗА 20 ГАДОЎ ПРЫРОДНЫХ КАТАСТРОФ СТАЛА БОЛЬШ У ЧАТЫРЫ РАЗЫ

**Пра гэта паведаміла брытанская дабрачынная арганізацыя «Оксфам».**

Паводле інфармацыі арганізацыі, на пачатку 80-х гадоў мінулага стагоддзя колькасць розных прыродных катастроф па ўсім свеце склала каля 120 за год. За 2007 год іх адбылося каля 500. Колькасць паводак і ўраганаў павялічылася з 60 у 1980 годзе да 240 летась. Акрамя таго, за гэтыя гады амаль на 70 працэнтаў узрасла колькасць ахвяраў стыхіі. У прыватнасці, з 1985 па 1994 год іх колькасць складала штогод каля 174 мільёнаў чалавек, а з 1995 па 2004 год — каля 254 мільёнаў чалавек за год.

### «ДЗЕСЯЦЬ НЕГРЫЦЯНЯТ» — РАСІСЦКАЯ КНІГА?

**У адной са школ штата Агаё адмянілі падрыхтаваную вучнямі п'есу паводле знакамітага дэтэктыва Агаты Крысці «Дзесяць негрыцянят» з-за расісцкага падтэксту ў назве.**

Акрамя таго, гарадскія і школьныя ўлады палічылі, што дэтэктыў правакуе генацыд і школьнае насілле, бо размова ў кнізе ідзе пра серыю забойстваў.

# Для інвалідаў павялічаць «броню»

За апошні час паказчыкі першага афармлення інваліднасці ў Беларусі зменшыліся з 45,7 да 41,3 выпадку на дзесяць тысяч насельніцтва, або прыкладна з 55—57 да 50—52 тыс. чалавек у год. Разам з тым, як адзначыла падчас сустрэчы з журналістамі намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марыяна Шчоткіна, гэта праблема застаецца па-ранейшаму вострай. Дастаткова сказаць, што зараз «на групе» знаходзяцца больш за паўмільёна грамадзян краіны, прычым асноўнымі прычынамі страты здароўя з'яўляюцца захворванні сардэчна-сасудзістай сістэмы, траўмы і анкалогія.

Зараз у дамах-інтэрнатах Беларусі пражывае больш за 16,5 тыс. чалавек, тым не менш, заўважыла Марыяна Шчоткіна, стаўка робіцца на аказанне дапамогі інвалідам па месцы жыхарства. У прыватнасці, сёння 21 тыс. чалавек з абмежаванымі магчымасцямі наведваюць сацыяльныя работнікі, для ляжачых хворых арганізаваны пагадзінны дзённы догляд, а ў большасці раёнаў — прадастаўляюцца паслугі сядзелак. Апроч таго, для інвалідаў вызначаны пералік тэхнічных сродкаў рэабілітацыі, якія выдаюцца бясплатна або на льготных умовах. Прычым пералік дапаможных сродкаў пашыраецца — ужо сёлета айчынныя вытворцы распрацавалі перасоўны ўмывальнік, універсальную крэсла-каляску, пачалі стварэнне новых матэрыялаў для пратэзна-артапедычных вырабаў.

Асобнай і няпростай тэмай можна назваць стварэнне безбар'ернага асяродку. Аналіз сітуацыі паказаў, што не так даўно для інвалідаў былі прыстасаваны ўсяго каля 20 працэнтаў аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры. Як паведаміла Марыяна Шчоткіна, ужо ў бліжэйшы час запланавана набыццё 20 спецыяльных чыгуначных вагонаў, 838 аўтобусаў з нізкай падлогай, рэканструкцыя 5815 будынкаў. Пры гэтым мяркуецца, што да канца 2010 года інваліды змогуць карыстацца прыкладна паловай грамадскіх і сацыяльных аб'ектаў, праўда, нельга не адзначыць, што ў першую чаргу выкананне гэтай задачы будзе залежаць ад сродкаў.

Таксама традыцыйна складанай праблемай трэба назваць працаўладкаванне інвалідаў. За апошнія дзесяць гадоў колькасць зваротаў людзей з абмежаванымі магчымасцямі па дапамогу ў службы занятасці ўзрасла больш чым утрая, а паказчыкі працаўладкавання павялічыліся з 26 да 44 працэнтаў. Аднак, зазначаюць у міністэрстве, гэты ўзровень яшчэ нельга лічыць прымальным, тым больш, што не сакрэт — нават год работы дазваляе інваліду перайсці з сацыяльнай на больш высокую працоўную пенсію. Таму, як паведаміла кансультант галоўнага ўпраўлення палітыкі занятасці і народанасельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Жана Шчэмелева, чакаецца, што ў наступным годзе кампенсацыйныя выдаткі наймальнікам на набыццё абсталявання пры ўладкаванні інвалідаў павялічацца з 1,6 да 2,6 млрд, выдаткі на працоўную рэабілітацыю інвалідаў дасягнуць 1,3 млдр рублёў, а броня на працаўладкаванне інвалідаў на прадпрыемствах і ў арганізацыях краіны ўзрасце прынамсі да 2 тыс. чалавек.

**Сяргей ГРЫБ.**

### НЕ ЎГОН, А ЛЖЫВЫ ДАНОС

Жыхар абласнога цэнтра вяртаўся з гасцей у стане, які несумяшчальны з кіраваннем транспартным сродкам. На вуліцы Болдзіна ён спыніўся і няцвёрдай хадой накіраваўся ў камерцыйны кіёск... па піва, на што звярнулі ўвагу людзі, якія знаходзіліся на прыпынку грамадскага транспарту. І патэлефанавалі па «мабільніку» ў ДАІ, паведаміўшы нумар аўтамабіля. А яго гаспадар пайшоў дамоў, адкуль паведаміў у міліцыю аб ...угоне сваёй машыны. Мерай пакарання за лжывы данос можа быць не толькі штраф, але і абмежаванне волі на тэрмін да двух гадоў.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

### НЕ ПІШЫ КОД НА КАРТЦЫ!

**У Наваполацкі ГАУС па дапамогу звярнуўся інжынер — мясцовы жыхар, які паведаміў, што ён забыў у банкамаце ААТ «ААБ Беларусбанк» пластыкавую картку і нехта зняў ягоныя грошы. Была ўзбуджана крымінальная справа.**

На Віцебшчыне рэгіструецца ўсё больш выпадкаў, калі злачынцы крадуць чужыя грошы ў банкаматах. А чаму б і не, калі адны пін-код пішуць прама на картцы, другія — фактычна самі адкрываюць свой электронны «кашалёк»?

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**




## Была — ваша...

**Кожны раз з асалодай чытаю «Вясёлыя і праўдзівыя гісторыі...», успамінаю сваё жыццё, але, на жаль, нічога падобнага ў ім не бачу...**

**Зрэшты, аднойчы, у маленстве, мы з маім сябрам Колем Прышывалка, помню, пасмяяліся... Проста да слёз.**

Было гэта ў пачатку пяцідзесятых гадоў мінулага ўжо стагоддзя. Жылі мы тады ўдваіх з маці ў невялікай вёсачцы Мушына. Сястра вучылася ў Ашмянах у спецыяльнай школе: глуханямой была — да вайны вясковыя медыкі не ўмелі лячыць шкарлятыну.

Мы цяжка жылі: з мушынскіх мужчын, што пайшлі ваяваць, назад не вярнуўся ніхто, сама вёска згарэла, у калгасе працавалі адны жанчыны. Рабілі — усё чыста! Ды, лічы, задарма, бо ўзамен атрымлівалі ў лепшым выпадку па некалькі кіль гірсы (так называлася смецце пасля ачысткі збожжа). Грошай жа — амаль не бачылі, бо зарабіць іх можна было толькі на ягадах, а каб іх прадаць, трэба было пехатой адмахаць 20 кіламетраў. Ды і што за іх выручыш?..

І вось тут — з'яўляюцца да нас два мужыкі, патрабуюць каб заплацілі падаткі, а не тое, маўляў, апішуць маёмасць. З яе ў нас з мамай была печка, два самаробныя ложкі, стол, зэдлік і... швейная машынка «Зінгер». Шыла яна — літаральна ўсё: дзеўкам сукенкі з парашутнага шоўку, які знаходзілі ў падбітых самалётах (як нямецкіх, так і нашых), бабам — ватоўкі, буркі (для іх, дарэчы, вельмі падыходзіла сукно з нямецкіх шынялёў)...

Машынка была ручная. І калі ў маці вельмі балелі рукі, ручку круціў я. Такім чынам мы абшывалі не толькі нашу вёсачку, але і шмат іншых. Платы не бралі. Бо... ніхто не даваў — не было чаго... Даць. Але ж нам дапамагалі: хто — засеяць ці ўбраць агарод, хто — нарыхтаваць дроў.

Вось за гэту машынку і ўхапіліся былі інспектары.

Але ж не тут тое было: маці з крыкам: «Не дам!» наляцела на іх такім крумкачом, што мужыкі зразумелі — саўладаць з удавой яны проста не змогуць. Пагразілі міліцыяй, судом, склалі пратакол, але пайшлі ні з чым.

Я на радасцях (адваявалі ж!) пабег да свайго сябрука і давай распавядаць, як што было. А бабулька яго — слухала-слухала ды і кажа: «А няхай бы яна (у сэнсе маці. — **Аўт.**) сказала, што машынка нямой».

Вось тут ад рогату мы і пакаціліся: бабулька ж старэнькая, непісьменная, яна не ведае, што правільна трэба казаць: «Машынка — не мая»... Рагочым, дурні-свавольнікі, а яна глядзіць на нас і нічога не разумее.

Якое ж было расчараванне, калі і мы зразумелі, што смяяцца не было з чаго. Бабуля ж мела на ўвазе маю сястрычку, нямую.

Зрэшты, гэта, слушная, як быццам, падказка ўсё роўна была б марнай. Інспектары тады не звярталі ўвагі ні на што. Ім трэба было любой цаной выбіваць грошы для аднаўлення разбуранай вайной дзяржавы.

**Іван АСТРОЎСКІ,** *г. Мінск.*

## Чароўная талерачка

Гора з дзецьмі я хапіла напоўніцу. Большаму сыну 12 было, калі мужык да іншай пайшоў, а меншаму 5. Але ж я — рук не апусціла, выгадавала, па прафесіі абодвум дала, можна сказаць, на ногі паставіла, нават два вяселлі зрабіла. Большы сын пасля жаніцьбы ў Расіі асеў, на радзіме жонкі, а меншы — застаўся ў Мінску. У інтэрнаце ім пакойчык далі. А кватэр няма. Ні ў аднаго, ні ў другога. Ды і маладыя ж: ім дзяцей раджаць, абжывацца, прыбірацца. Хто ім дапаможа, як не родныя бацькі? Я дзве каровы стала трымаць, па чацвёра свіней, плюс куры, гусі, трусы...

Сын (бліжэйшы), дзякуй Богу, ва ўсім дапамагаў мне — яны з жонкай часта прыязджалі. А ўжо збяруцца дамоў ад'язджаць, я ім і капейку якую падкіну, і мяса, і гародніны... Нявестка, не бяды, што гарадская, ні ад чаго не адмаўлялася. Аднаго разу, перад ад'ездам, помню, палуднаваць селі, бабка ў талерцы засталася. «Можа, возьмеш?», — кажу. Яна — ад слова — другую талерачку зверху плясь і ў машыну панесла. На вячэру будзе, маўляў...

Але ж пра тое я і думаць забылася б, калі б не выпадак. Ды яшчэ і які! У мяне, нарэшце, унучка з'явілася! Накупляла я тады ну ўсяго, што ў нашай краме было — цацак, пялюшак, паўзункоў, закалола парсючка, нарабіла прысмакаў, папрасіла суседку, каб на гаспадарцы пабыла, а сама — гайда ў адведзіны.

Не скажу — усё там па-людску было. Нявестка стол зрабіла, нагатавала ўсяго. Гасцей трохі сышлося — пасядзелі, пасвяткавалі. Глядзіш — трэба збірацца ўжо. Сын пайшоў малую забаўляць, а нявестка са стала ўсё прымае і з сабой мне — нічога не дае.

Яно, як быццам і правільна — сваё ўсё ёсць. Але ж я бабу папрасіла, каб на гаспадарцы пабыла — кароў падаіла, пакарміла свіней ды курэй, каб за домам наглядала. Яна ж мяне чакае ўжо. І мне ж, прыехаўшы, трэба будзе ёй пра ўсё расказаць ды пачаставаць нечым. Ну не тым жа, што і ў яе, і ў мяне ў халадзільніку ляжыць?!.. Смачнейшае нешта трэба, гарадское. І каб тут нічога не было, не заставалася, а то і салатаў розных, і тартоў, і адбіўных, і галубцоў... А не папросіш. І ў краме, мусіць, не купіш ужо, бо сцямнела — дзе тут тыя магазіны шукаць?

Карацей, зажурылася я: і сказаць нічога не магу, і паехаць з пустымі рукамі таксама?..

Як на шчасце — нявестка апошнюю талерку ў халадзільнік суне — маю, тую самую, што з бабкай некалі брала. «Ат, думаю, была ні была! Не ўгняўлю яе, можа?» Кажу: «Дочачка, можна я гэту талерачку з галубцамі ў сумку сабе пакладу? Піліпчыха ж прыйдзе, трэба неяк аддзячыць, што пусціла мяне...».

Зачырванелася маё дзіця, кажа: «Прабачце, мама... А я ж — во дурніца — сама не здагадалася!..». І з гэтымі словамі ў слоічкі салатаў, у пакеты мяснога ўсяго, у місачкі тартоў. «Досыць, — кажу, — не трэба мне столькі», а яна ўсё роўна кладзе.

До, што прыехала я дамоў не з пустымі рукамі — смакаты навезла: з Піліпчыхай два дні спажывалі. Яна казала, што заўсёды будзе мяне да сыноў пускаць. Толькі я не вельмі ўжо рвуся. Толькі ў адведзіны ды на хрэсьбіны, а так — хай яны прыязджаюць. Яны, без гаспадарак, вальнейшыя.

**Галіна С.,** *Капыльскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**


## ИНФОРМАЦИОННОЕ СООБЩЕНИЕ ОБ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРИНАДЛЕЖАЩИХ ГОСУДАРСТВУ АКЦИЙ

| Наименование акционерного общества, акции которого предлагаются к продаже на аукционе | Уставный фонд (УФ) | Номинальная стоимость акции | В собственности государства по состоянию на 1 ноября 2007 года | | Начальная цена продажи 1 акции | Предлагается для продажи | | Количество акций, штук акций/начальная цена продажи акций, тыс. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | штук акций | руб. | штук акций | в % к УФ | руб. | штук акций | в % к УФ | |
| Савушкин продукт | 800000 | 25000 | 9104 | 1,1 | 46100 | 9104 | 1,1 | 9104/ 419695 |

**Примечание:** Аукцион состоится **28 декабря 2007 года** в 11 часов по адресу г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 524 (здание облисполкома).

Для участия в аукционе необходимо представить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанный договор о задатке с фондом «Брестоблимущество».
2. Заверенные банком копии платежных поручений:
— о внесении суммы задатка на р/с 3642202530011 Головной филиал по Брестской области ОАО «Белинвестбанк», код банка 823, получатель платежа — фонд «Брестоблимущество», УНП 200020538;
— о внесении специального сбора за подачу заявления на участие в аукционе в размере 4 базовых величин и платы за регистрацию участников аукциона в размере 0,5 базовой величины на р/с 3600201000015 филиал № 100 ОУ ОАО «СБ «Беларусбанк», код 246, назначение платежа 03107, УНП 200300543, получатель платежа — финансовое управление Брестского облисполкома.
3. Юридическими лицами — резидентами Республики Беларусь — нотариально заверенные копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации.
4. Юридическими лицами — нерезидентами Республики Беларусь — легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть проведена не ранее 6 месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения.
5. Индивидуальными предпринимателями — резидентами Республики Беларусь, индивидуальными предпринимателями — нерезидентами Республики Беларусь — нотариально заверенная копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя.
6. Юридическими и физическими лицами, индивидуальными предпринимателями — нерезидентами Республики Беларусь — документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим его банком или иной кредитно-финансовой организацией с заверенным в установленном порядке переводом на русский язык.
7. Представителями юридических, индивидуальных предпринимателей — надлежаще оформленная доверенность (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель).
8. Представителями физических лиц — резидентов Республики Беларусь — нотариально заверенная доверенность.
9. Представителями юридических и физических лиц, индивидуальных предпринимателей — нерезидентов Республики Беларусь — легализованная в установленном порядке доверенность.
10. Документ, подтверждающий согласие антимонопольного органа на совершение сделки, в случаях, установленных законодательством Республики Беларусь.

Участник аукциона, выигравший торги, возмещает организатору аукциона затраты, связанные с организацией и проведением аукциона, в размере 4-х % от начальной цены предлагаемого к продаже пакета акций.

Договор купли-продажи должен быть подписан не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Порядок оформления участия в аукционе и проведения аукционных торгов определяется Инструкцией о проведении аукционов по продаже принадлежащих Брестской области акций, утвержденной решением Брестского облисполкома от 3 августа 2007 года № 604.

*Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 224006 г. Брест, ул. Ленина, 11, каб. 113, фонд «Брестоблимущество» с 8.30 до 17.30 по рабочим дням по 27 декабря 2007 года включительно.*

**Контактные телефоны в г. Бресте: (80162) 23 44 06, 23 12 63**
**www.brest-region.by**

УНП 200020538.


# РЭХА ТРАГЕДЫІ ЛЯ ГРЫБНОГА

У глухім лясным куточку Пухавіцкага раёна з'явіўся помнік — напамін пра адну з безлічы трагічных падзей Другой сусветнай вайны, якая доўгі час заставалася забытай. Мінула 66 гадоў ад першай ваеннай восені, калі пад гэтымі дрэвамі былі жорстка забіты адзінаццаць яўрэяў. Магчыма, жудасная старонка пакутнага лёсу Беларусі была б





назаўсёды сцёртая з памяці, каб не ўспаміны адзінага сведкі, колішняга жыхара вёскі Грыбное Івана Карпука. У вайну хлопчыку Янку было толькі сем гадоў, але ён ніколі не забываў ні яўрэйскіх дзяцей, сярод якіх былі яго шасцігадовыя сябры Ізік і Моўшык, ні дарослых, якія зрэдку з'яўляліся ў вёсцы ў пошуках вопраткі і ежы. Знішчэнне гэтых людзей назаўсёды ўрэзалася ў ранімую дзіцячую памяць. З дапамогаю Івана Карпука краязнавец, сын партызана, цяперашні мінскі пенсіянер Уладзімір Каско змог даследаваць ваенныя падзеі ў гэтых мясцінах і ўдакладніць многія дэталі гібелі трох яўрэйскіх сем'яў — жыхароў мястэчка Шацк. Таму не выпадкова Іван Карпук і Уладзімір Каско былі ўдзельнікамі цырымоніі адкрыцця памятнага знака. І іхнія ўспаміны і развагі нельга было спакойна слухаць.

Яўрэйскія пагромы ў акупаванай Беларусі пачаліся ўжо ў ліпені 1941-га. Тры сям'і з Шацкага гета апынуліся ў лесе каля вёскі Грыбное невыпадкова — тут знаходзілася смалакурня, месца было далёкае, схаванае ад вачэй. Яны нікому не зрабілі нічога дрэннага, але, каб застацца жывымі, трэба было хавацца. Беларускі лес, як вядома, уратаваў жыцці многім, каго чакаў лёс ахвяраў Халакоста. Але ў гэтых хоць і глухіх мясцінах сярод добразычлівых і спагадлівых людзей знайшоўся і той, хто данёс паліцыі пра шацкіх уцекачоў. Пакінуць сваё, здавалася, надзейнае сховішча, гэтыя няшчасныя не паспелі. Фашысцкіх карнікаў і іх паслугачоў, хуткіх на расправу, як вядома, нічога не спыняла. Яны прымусілі сваіх ахвяраў капаць сабе яму-магілу, кідалі ў яе і забівалі, спачатку дзяцей, за імі — дарослых. Нікога не пашкадавалі. Два хлопчыкі-браты ўсё ж вырваліся, спадзеючыся ўцячы, але на іх пусцілі аўчарак.

— Магчыма, сюды забрыдзе выпадковы грыбнік ці ягаднік, прачытае на помніку гэтыя словы, задумаецца, а можа на імгненне ўявіць,




якая жудасная трагедыя адбылася тут і што думалі людзі ў апошнія хвіліны, калі на іхніх вачах забівалі дзяцей, — сказаў на цырымоніі адкрыцця заслужаны архітэктар Беларусі, лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій, старшыня Беларускага саюза яўрэйскіх абшчын Леанід Левін.

Сёлета ў Беларусі ўстаноўлена яшчэ дзесяць новых памятных знакаў ахвярам Халакоста. А на гэтых здымках — сціплы мемарыял у лесе пад вёскай Грыбное і яе колішні жыхар Іван Іванавіч Карпук.

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**


ОАО «Руденск» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

**ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ**

здания склада (об. пл. 463,4 кв. м, железнодорожная ветка), расположенного по адресу: Пуховичский район, г. Руденск, ул. Железнодорожная, 3. Начальная цена с НДС – 247 800 000 белорусских рублей. Площадь земельного участка – 0,0723 га. Объект продается без условий. Задаток 5 % от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней после проведения аукциона. Переход прав на земельный участок будет произведен по решению местного исполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 29 декабря 2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 28 декабря 2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Телефон (8017) 224 61 34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015.

**КУП «МИНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ЦЕНТР УЧЕТА НЕДВИЖИМОСТИ»** проводит повторный открытый аукцион по продаже земельного участка общей площадью 0,2499 га для индивидуального жилищного строительства в д. Бровки Минского района. Начальная цена – 37 560 000 бел. рублей. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 25.09.2007 г. Аукцион состоится 06.12.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по 05.12.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, д. 5, к. 326.

**Контактный телефон (8-017) 224-61-34.**
**Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

УНП 690324015.

